*Алена Масла*

# *Вандроўка з божымі кароўкамі*

KAMUNIKAT.org

Мінск 2006
Мастацкая літаратура

# *Сіла хлеба нябеснага*

KAMUNIKAT.org

**Салодкае жыццё**

Знаёмцеся: божыя кароўкі Ірыска і Хлебны Мякіш. Пра сяброўак можна сказаць, што жывуць яны салодкім жыццём. Мяркуйце самі. У Ірыскі імя – цукерачнае, хатка – з цукерак: падмурак зладжаны з батончыкаў, сцены – з цаглінак-ірысак, дах крыты шакаладам, а вокны шклёныя ледзянцамі! Мэбля ў хатцы – з карамелек, а падушкі і пуфікі для сядзення – з мяккіх жалацінак.

Хлебны Мякіш мае хатку з бісквітнага цеста, размаляваную рознакаляровымі глазурамі і пакрытую марцыпанамі.

Не думайце, што сяброўкі – лайдачкі і толькі тым занятыя, што пестуюцца сярод гэтай раскошы. Насамрэч незвычайныя імя і хаткі божыя кароўкі маюць з-за сваёй работы: з неба на зямлю яны носяць цукеркі і хлеб.

Вам не верыцца! А ўспомніце, колькі разоў самі спявалі:

*Божая кароўка,*

*Паляці на неба,*

*Там твае дзетачкі*

*Ядуць цукерачкі.*

*Сама паясі –*

*І нам прынясі!*

Або:

*Божая кароўка,*

*Паляці на неба,*

*Там анёлачкі жывуць,*

*Табе хлебца дадуць*

Думаеце, пажартавалі – на тым справа і скончылася? Не, мае даражэнькія, пасля такіх просьбаў Ірыска і Хлебны Мякіш выпраўляюцца ў дарогу – не здарма ж песня складалася!

Праўда, даўней божыя кароўкі – іх сваячкі -- толькі рабілі выгляд, што на неба заспяшаліся. Самі адляталі крыху – і займаліся звыклай работай, тлю нішчылі: у белы ж свет як у капейку ляцець не кожны захоча.

А Ірыска і Хлебны Мякіш рады старацца! Ім жа на месцы не сядзіцца! Падавай прыгоды, розныя здарэнні, новых знаёмых! З лістка на лісток па навакольных кустах ды дрэвах пералятаючы, шмат прыгод не сустрэнеш. Вось і любяць сяброўкі падарожнічаць. Аднойчы, як дзеці на зямлі сталі ў божых каровак хлеба ды цукерак прасіць, сяброўкі сабраліся – і паляцелі на неба. А там сапраўды знайшлі ўсё, пра што ў песнях чулі.

Ад той пары, як толькі завядзе хто з дзяцей песні з просьбамі, не марудзячы, шнуруюць сяброўкі чаравічкі, бяруць парасоны, хапаюць торбачкі, якія заўсёды ляжаць напагатове, – і ў дарогу...

Спяшаюцца, крутаюць – але, шчыра кажучы, ніхто яшчэ з дзяцей іх не дачакаўся. Усе ж думаюць, што проста пажартавалі!.. Ды божыя кароўкі і не крыўдуюць. Гасцінцамі з неба частуюць сяброў і знаёмых – усе мятлікі, стракозы, жучкі каля іх ласуюцца. А пра сваякоў і казаць няма чаго – ні разу не селі чаю папіць без

цукерак і булак. І, канешне ж, усе любяць Ірыску і Хлебны Мякіш – і за тое, што не скупыя, і за тое, што так паблажліва ставяцца да нежадання сваякоў далёка ад хаты адлучацца.

Ірыска і Хлебны Мякіш – вельмі сціплыя божыя кароўкі і не любяць, калі іх хваляць, называюць адважнымі вандроўніцамі і першаадкрывацелькамі.

Але гэта – чыстая праўда! Шмат цікавых прыгод і здарэнняў адбываецца з сяброўкамі падчас іх падарожжаў.

Не жадаючы пакрыўдзіць простых божых каровак, якія робяць надзвычай важную работу -- ратуюць расліны ад тлі, усё ж скажу: ім нават не ўяўляецца, што могуць тыя, хто не збаяўся за аблокі падняцца.

## У палоне шэрых туманоў

Пра адну з вандровак божых каровак я і раскажу.

Было гэта ў той год, калі зімой не выпаў снег і мароз не замарозіў рэчкі. Сонейка таксама не выглядвала ўсю зіму. Пасля яго не было вясной. Затым лета пачалося без сонейка.

Уся зямля патанала ў густым шэрым тумане. Шкоднікаў – розных благіх мікробаў і лічынак -- без марозу і сонца, ад якіх яны гінуць, на зямлі распладзілася як ніколі. Адной толькі тлі развялося процьма! Была яна надзвычай пражэрлівая, і маладзенькая лістота гінула, не паспеўшы ўзяць клёку. Божыя кароўкі шчыравалі, але тля старалася таксама, яе было намнога больш, таму дрэвы і кусты хутка сталі нагадваць абгладаныя венікі. Усё адно божыя кароўкі не здаваліся і ваявалі са шкоднікамі з усіх сіл.

Благім надвор’ем дзеці сядзелі ў хатах і ніхто не звяртаўся да божых каровак з просьбай злётаць на

неба. Нарэшце недзе ў сярэдзіне лета папрасіў злётаць па хлеб нейкі хлопчык з дома на ўскрайку горада. Хлебны Мякіш адразу ж пусцілася ў дарогу.

Ірыска засталася дома. Разам з астатнімі божымі кароўкамі дзень пры дні яна нішчыла тлю і чакала вяртання сяброўкі. Але час ішоў, дзесяць разоў можна было абярнуцца туды і назад, а сяброўкі ўсё не было.

Хвалявалася за яе не толькі Ірыска. Усе сваякі і суседзі чакалі Хлебны Мякіш. Пакуль што маўчалі пра горшае, але не-не, ды ўздыхалі ўпотай: ці не здарылася што благое з адважнай вандроўніцай у дарозе?

Каб не ўпасці ў адчай самой і падтрымаць сяброў, Ірыска штовечар ладзіла застоллі. Абрусамі, пашытымі з пялёсткаў кветак, накрывала стол, запарвала зёлкі ў гарбатнічку, па талерках раскладала разнастайныя ласункі. Госці збіраліся, частаваліся, шчыра дзякавалі Ірысцы за

хвіліны радасці, але доўга не бавіліся – спяшаліся зноў на работу.

А пасля цукеркі ў Ірыскі скончыліся. Яна ж даўно за цукеркамі не лётала. Прыпасы, якімі былі набітыя шматлікія кладовачкі, без аднаўлення расталі хутка. Канешне, для сяброў Ірыска без шкадавання магла разабраць і сваю салодкую хатку – новая некалі адбудуецца! Але тады для ўсіх стане відавочным, як безнадзейна зацягнулася шэрае надвор'е. Сапсуецца настрой, прападзе баявы дух – і тады ўжо не будзе ў божых каровак надзеі на перамогу над тлёй!

Таму Ірыска трымалася што ёсць моцы. Як сышлі прыпасы, стала разбіраць і падаваць на стол мэблю з карамелек, пуфікі з жалацінак. Гэта для староннягa вока пакуль што заўважным не было.

А калі ўсё салодкае начынне з хаткі было ўрэшце з'едзена, Ірыска задумала дастаць ледзяніцы з вокнаў. Сваякам бы сказала, што гэта – новая сістэма вентыляцыі, і яны б паверылі.

## Вяртанне Хлебнага Мякіша

Толькі яна ўзялася за справу, як раптам пачула даўгачаканае:

-- Прывітанне, сяброўачка!

Хлебны Мякіш, змучаная, перапэцканая ў нешта чорнае – ажно кропачак на крылцах не відаць, але – жывая! – стаяла на парозе. І трымала торбачкі, поўныя хлеба.

Ірыска кінулася да сяброўкі з прывітаннямі, сабралася клікаць сваякоў і сяброў… Але Хлебны Мякіш па-змоўніцку глянула на яе, прыклала да вуснаў лапку, што азначала:”Маўчок!” Папрасіла:

-- Нельга губляць ні хвілінкі. Толькі ў лазеньку абмыцца – і ляцім са мной! У дарозе раскажу падрабязнасці.

Лазенька ў божай кароўкі заўсёды напагатове, бо любіць, каб крылцы блішчэлі і ўсе сем кропак вырзна былі бачныя. Таму ў скручаны лісток з вечара збірае яна свежую расу. Да лістка прымацавана тоненькая павуцінка.

Як трэба – тузанеш за яе, лісцік раскрыецца і абдасць вадою.

Дык вось Ірыска хуценька на сяброўку свежую расу з лісточка выліла, рушніком-травінкай крылцы да бляску працерці дапамагла і запытала:

-- Куды ляцім?

-- Да таго, хто прасіў па хлеб злётаць, -- адказала Хлебны Мякіш.

Ірыска падхапіла торбачкі з хлебам, каб дапамагчы здарожанай сяброўцы, і божыя кароўкі паляцелі да дома на ўскрайку горада.

KAMUNIKAT.org

**Нечаканая навіна**

-- Ты думаеш, хлопчык чакае? – запыталася сяброўку Ірыска. – Усе ж просяць жартам…

-- Так трэба, Ірыска, каб чакаў! – усклікнула Хлебны Мякіш і, памаўчаўшы, дадала: -- У Краіне Паветраных Замкаў бяда!..

Ірыска ажно здрыганулася ад пачутага. Бяда ў Краіне Паветраных Замкаў! Гэта ж краіна, дзе жывуць самыя прыгожыя чалавечыя мары. Пра што б на зямлі людзі не марылі, якія б паветраныя замкі не будавалі – усе яны траплялі ў гэту чароўную краіну.

Яна раскінулася адразу за аблокамі, і па дарозе ў Цукерачную і Хлебную даліны божыя кароўкі заўсёды адпачывалі ў яе прыветных жыхароў. Што ж за бяда іх напаткала?..

-- Пасля таго, як хлопчык праспяваў просьбу, -- працягвала расказваць Хлебны Мякіш, -- я выправілася ў дарогу, на неба. Туман станавіўся ўсё гусцейшым, дарогі не разабраць, таму ляцець

было надзвычай цяжка. Калі ж я нарэшце паднялася за аблокі, то і там не ўбачыла сонечнага святла. Гэта здзівіла мяне і я вырашыла адразу ляцець у Хлебную даліну, не спыняючыся на адпачынак. Я асцерагалася, што туман стане такім густым, што не разбяру дарогі дадому… На шчасце, у Хлебнай даліне ўсё па-ранейшаму: цёпла, светла, радасна. Напакаваўшы хлебам торбачкі, я пусцілася ў зваротны шлях.

Я ўжо сказала: у даліне было светла. На памежжы з Краінай шарэла, а далей – хоць вока выкалі, не было бачна нічога. Я ляцела ў суцэльнай цемры, не ўяўляючы, дзе знаходжуся. І раптам пачула ціхі плач.

-- У Краіне Паветраных Замкаў – плач? Такога не можа быць! – усклікнула Ірыска.

-- Кажуць жа табе: у іх там бяда! Зачыніўшыся ў пакоі, каб ніхто з падданых не бачыў яе, плакала каралева Краіны, Мара Сапраўдная. Але акно было прыадчыненае, і я, блукаючы, выпадкова трапіла ў пакой праз яго.

-- Каралева пазнала цябе? – усхвалявана спытала Ірыска.

-- Пазнала, і вельмі ўзрадвалася майму з’яўленню. Сказала, што я прынесла ў Краіну надзею... Уяўляеш, Ірыска, у іх там прынцэса Чысцюля прапала! А злы чараўнік Куродым і яго памагаты Дзюрабой вось-вось запануюць не

толькі ў Краіне, а над усім светам! -- выдыхнула, ледзь рашыўшыся ўслых прамовіць такую навіну, Хлебны Мякіш.

-- Што ж гэта робіцца! – пляснула ў ладкі Ірыска. -- Што сабе жыхары Краіны думаюць, чаму не шукаюць прынцэсу? Што гэта за мары такія, што нічога зрабіць не могуць?

-- Мары як мары, сваёй работай займаюцца – мараць, -- адказала Хлебны Мякіш. – І мараць яны пра некага, хто знойдзе прынцэсу і ўсіх іх ратуе.

-- І дзе ўзяць гэтага “некага”? – спытала Ірыска.

-- Тут, на зямлі. Каралева таму і сказала, што я прынесла ў Краіну надзею. Нам трэба знайсці такога летуценніка, які без лішніх пытанняў згадзіўся б  выправіцца ў Краіну…

-- …і ты думаеш, што хлопчык, да якога мы цяпер ляцім, пагадзіцца на гэта? – прадоўжыла за сяброўку Ірыска.

-- Паглядзім, -- няпэўна адказала Хлебны Мякіш. – Урэшце, ён адзіны, хто падчас туманоў успомніў пра неба. Гэта абнадзейвае…

-- Паглядзім, -- пагадзілася Ірыска.

## Сустрэча з Данікам

Хлопчыка звалі Данікам, а яшчэ часцей -- безнадзейным летуценнікам. Галава яго была пад завязку набітая рознымі марамі. Таму пра яго яшчэ казалі, як кажуць пра ўсіх фантазёраў: будуе паветраныя замкі. Гэта было праўдай, і з гэтай нагоды Данік ніколі не чуў, пра што з ім гавораць дарослыя, што пытаюць. Калі хадзіў, глядзеў не пад ногі, а ў неба – таму часта падаў, біў калені і рваў штонікі. Дарослыя толькі ўздыхалі і бясконца паўтаралі: “Спускайся з нябёсаў на зямлю!”

Дарослыя вельмі хваляваліся, як жа прыйдзецца вучыцца Даніку ў школе – восенню ён павінен стаць першакласнікам. Перажывалі, што занадта многа ён у аблоках лунае.

Але дарма яны так хваляваліся! Данік не проста марыў, а заўсёды стараўся зрабіць нешта, каб мары свае ажыццявіць. Калі вельмі хацелася пабыць, скажам, капітанам, Данік мог напусціць вады ў ванну і пускаць там караблікі, пры гэтым уяўляючы

сябе пасярод бязмежнага акіяну... Або маляваў дыназаўраў, калі карцела марыць пра іх.

І ён сапраўды чакаў, калі вернецца божая кароўка і прынясе з неба хлеб. Ды не толькі марыў, а дзейнічаў: кожны дзень выпускаў у неба паветраныя шары. Гэта ён рабіў на ўсялякі выпадак. Калі ў тумане божай кароўцы цяжка будзе знайсці дарогу на зямлю, паветраныя шары, спадзяваўся ён, падкажуць ёй патрэбны накірунак.

Таму, убачыўшы божых каровак, Данік першы крыкнуў: “Прывітанне!” – і ні кропелькі не здзівіўся, калі яны селі да яго на далонь і загаварылі.

-- І табе прывітанне! – выгукнулі божыя кароўкі. Пасля, узяўшыся за краёчкі спаднічак, дружна прыселі і пакланіліся. -- Ірыска і Хлебны Мякіш! – назваліся яны хлопчыку. А Хлебны Мякіш дадала:

-- Як і прасіў, я прынесла хлеб з неба! -- Яна развязала торбачкі і высыпала на далонь хлопчыку маленькія духмяныя боханы.

Данік еў незвычайны хлеб, а божыя кароўкі наперабой расказвалі яму пра Краіну Паветраных

Замкаў. Што замкі там будаваныя з паветра і шарыкаў, якія людзі выпускаюць у неба. І жывуць у гэтых замках мары. Што ва ўладароў Краіны – Мары Сапраўднай і караля Летуценніка Непапраўнага ХХ – ёсць дачушка, прынцэса Чысцюля.

Хлопчыка не здзіўлялі іх расказы, ён толькі задаволена ківаў галавой: як здорава, што Краіна, якую ён столькі разоў ўяўляў, сапраўды ёсць!

Калі ж пачуў, што прынцэса Чысцюля прапала і трэба яе ратаваць, рашуча прамовіў:

-- Я знайду прынцэсу!

Як толькі Данік гэта сказаў, ён адразу паменьшыўся, а божыя кароўкі пабольшалі. Хлеб з неба аказаўся цудадзейным: рашучасці хлопчыка і яго жадання дапамагчы прынцэсе аказалася дастатковым, каб падарожжа адбылося!

Ірыска пасадзіла Даніка сабе на плечы – няхай Хлебны Мякіш пакуль адпачне – і божыя кароўкі разам з хлопчыкам паляцелі за аблокі.

# *Зладзейства чарадзея Куродыма*

KAMUNIKAT.org

## Вялікі клопат прынцэсы Чысцюлі

Прынцэса Чысцюля была незвычайнай дзяўчынкай. І не толькі таму, што насіла на галаве карону. Сотні прынцэс маюць такое ўпрыгожанне, аднак застаюцца шараговымі дзяўчаткамі, якія больш за ўсё на свеце любяць прыбрацца, паласавацца салодкім, патанцаваць на балях і затлуміць галаву якому-небудзь заезджаму прынцу.

Не тое, каб прынцэса Чысцюля была абыякавай да ўсіх гэтых асалод. І танцавала яна адмыслова, і сукенкі насіла прыгожыя, і заўсёды пра запас мела ў кішэні жменьку цукерак. А што да прынцаў, то яны ў чэргі

выстройваліся, каб хоць адным вокам зірнуць на прынцэсу -- такая была яна пекная.

Аднак быў у прынцэсы Чысцюлі абавязак, якога не мелі не тое што іншыя прынцэсы, а ніхто болей ў свеце.

Кожны дзень на досвітку прынцэса выпраўлялася на сваю варту. Яна садзілася на

хмарку і праз чароўнае рэшата прасейвала паветра, што падымалася ад зямлі. Паветра ж толькі здаецца празрыстым. Насамрэч, яно напоўнена чалавечымі думкамі і марамі. Нават тымі, што людзі ніколі ўголас не выказваюць. Бо паветрам дыхаюць, яно трапляе ў самыя патаемныя куточкі душы – і яму ўсё пра нас вядома.

Вось так – з усімі нашымі думкамі і марамі – падымаецца паветра на неба. І спачатку трапляе на чароўнае рэшата да прынцэсы Чысцюлі. Яна яго прасейвае. Добрыя думкі і мары пускае ў Краіну Паветраных Замкаў. А вось злосныя, сквапныя, чорныя, а таксама дым ад заводаў і фабрык, ад цыгарэт і машын пакуе ў вялікія торбы і завязвае крэпкімі вяровачкамі -- каб не вырваліся. Пасля памочнікі прынцэсы выкідваюць торбы ў чорныя касмічныя дзюркі. Лічылася, што там, на сметніку, яны ў бяспечным месцы і нікому не прынясуць шкоды.

## Касмічны пірат Дзюрабой вызваляе Куродыма

Так і было да нядаўняй пары, пакуль не трапіў у нашу галактыку касмічны пірат Дзюрабой. Лайдак, праныра і боўдзіла, ён нічога добрага рабіць не ўмеў. Шнарыў на сваёй лятаючай талерцы па Сусвету, шукаючы, дзе якую шкоду ўчыніць.

Мянушку сваю Дзюрабой атрымаў за тое, што заўсёды цягаў у руках даўжэзны пруток. І ва ўсё, што траплялася яму на вочы, гэтым прутком

торкаў – так адбывалася яго знаёмства з навакольным светам.

Дзюрабой, як і астатнія яго суродзічы – міжгалактычныя піраты – бадзяліся па Сусвету ў пошуку багаццяў. Усе піраты марылі некалі дабрацца да Зямлі. Бо не было прыгажэйшай і багацейшай за яе планеты. Але нічога да гэтай пары не атрымлівалася ў піратаў. Магутнай заслонай на шляху да Зямлі стаяла Краіна

Паветраных Замкаў. Добрыя думкі, памкненні і мары атулялі Зямлю, былі для яе непарушнай заслонай.

Але так сталася, што аднойчы Дзюрабой дапяў на прасторы каля Зямлі якраз з боку касмічнага сметніка. Ён убачыў вялізныя торбы, моцна завязаныя вяровачкамі – і давай іх прутком пароць. Усе прадзіравіў! І тады ўсё благое, увесь чад, злосць і чорныя думкі, так прадбачліва адсеяныя і сабраныя прынцэсай Чысцюляй ў торбы, апынуліся на волі! Адна да адной яны хуценька збіліся да кучы… І нават Дзюрабой спалохаўся, калі агромністая чорная хмара пачала рухацца, з яе палезлі тысячы даўжэзных шчупальцаў, а грамавы голас абвясціў:

-- Воля! Воля магутнаму чарадзею Куродыму! Знішчу ўсіх, хто мяне ў торбах трымаў!

Дзюрабой імгненна скеміў, што мае справу з некім, непамерна за яго мацнейшым, і ў галаве яго з’явіўся хітры план. Ён кінуўся на калені і, б’ючы паклоны, закрычаў што ёсць моцы:

-- Слава, слава вялікаму чарадзею Куродыму!

Куродым глянуў туды, адкуль чуўся голас, і ўбачыў Дзюрабоя. Гневам блiснулi яго вочы. Схапіўшы шчупальцамі насмерць перапалоханага пірата, чарадзей пачаў яго трэсці.

Дзюрабой дрыгаў рукамі і нагамі, імкнучыся адбіцца ад нападзення і верашчаў:

-- Уладар, што ты робіш! Я твой прыслужнік! Я дапамог табе вызваліцца!

Нарэшце Куродым, якому злосць засціла вочы і вушы, пачуў енк. Ён спыніўся, уважліва зірнуў на Дзюрабоя. Той калаціўся і зубамі выбіваў чачотку, але з усёй сілы сціскаў у руцэ сваю нязменную зброю – даўжэзны пруток.

-- Дык гэта ты прапароў гэтыя дурныя торбы? – зароў ён.

-- Я, я, уладар, больш некаму!

Куродым агледзеўся па баках: праўда, побач больш нікога. Тады Куродым палагаднеў роўна настолькі, на колькі мог. І ўжо не зароў, а проста закрычаў:

-- Дык чаму трасешся, ёлупень? Будзеш маім прыслужнікам – ацалееш!

Пасля ён тыцнуў у бок Зямлі:

-- Над гэтай планетай -- Краіна Паветраных Замкаў. Там -- мая крыўдзіцелька, прынцэса Чысцюля. Яе трэба схапіць! Знішчаць адразу не буду, пасаджу ў торбу – няхай пакутуе! – загрымеў Куродым. – Краіну на пыл сатру! А ты мне дапаможаш!

-- Слухаюся, уладар! – ледзь не зламаў спіну ў паклоне Дзюрабой.

KAMUNIKAT.org

## Планы Дзюрабоя пачынаюць здзяйсняцца

Толькі што перажыты страх змяніўся радасцю, якую разбойнік ледзь стрымліваў. На Зямлю, жаданую, але недасягальную для многіх пакаленняў

яго суродзічаў планету, з дапамогай магутнага чарадзея ступіць

ён, пірат Дзюрабой! І стане легендай, Дзюрабоем Першым, уладаром

непамерных багаццяў! І не будзе ўжо сноўдацца па закутках Сусвету!

Атабарыцца тут, будзе жыць на Зямлі, пакуль не спажыве і не распрадасць усё, што на ёй ёсць!!!

У паспяховасці прадпрыемства касмічны пірат цяпер нават не сумняваўся. Яго хітры план не толькі імгненна нарадзіўся, але ўжо пачынаў збывацца! Побач быў чараўнік, ад аднаго погляду на якога нават Дзюрабоя пачынала трэсці. І гэта было цудоўна!

Чым страшнейшы, тым мацнейшы! Чым гучней крычыш, тым больш баяцца! Чым больш напускаеш страху, тым больш цябе слухаюцца! Гэтыя законы кожнаму касмічнаму пірату знаёмыя адмалку. А Куродым быў проста неверагоднай страшылкай! Ад яго выгляду ўсе мары ў Краіне памлеюць і сканаюць. І тады ўжо ён, Дзюрабой Першы, вароніць не будзе! Цапу-лапу – прабярэцца на Зямлю і ўсе яе багацці сабе прыбярэ!..

Ад думак пра славу і багацце Дзюрабой застыў... І атрымаў такога кухталя, што іскры з вачэй пасыпаліся!

-- Што рот разявіў?! – заравеў страшным голасам Куродым. – Марш лавіць Чысцюлю!

І, схапіўшы свайго памагатага, нырнуў з ім у жэрла чорнай дзюркі ў накірунку Зямлі.

...Ніхто ў Краіне не чакаў нападзення. Прынцэса, як заўсёды, сядзела на воблачку і прасейвала паветра праз чароўнае рэшата. Побач

з ёй стаялі торбы, прыгатаваныя для адпраўкі на касмічны сметнік.

Куродым знянацку абрынуўся на Краіну. Дзюрабой вырваў з рук прынцэсы чароўнае рэшата. Разбойнікі схапілі дзяўчынку і разам з ёй сіганулі на воблакі, што плылі па-над Краінай Паветраных Замкаў.

Вось ад той пары ніхто ў Краіне і не бачыў прынцэсы Чысцюлі. Некаму стала прасейваць паветра, што падымалася з зямлі на неба. Не ачышчанае, яно змешвалася з агромністай хмарай Куродыма. Злы чарадзей ад гэтага ўсё мацнеў. Распластаўшыся над Краінай Паветраных Замкаў, ён паразвесіў свае кудлатыя патлы – і яны павіслі туманамі над зямлёй. Не змаглі праз іх прабіцца ні сонечнае святло, ні снег. Таму на зямлі і панавала шэрае панылае надвор'е.

А ў Краіне Паветраных Замкаў наогул гаспадарыла цемра – хоць вока выкалі. Час ад часу Дзюрабой выбіраўся з-пад крыла свайго

ахоўніка на шпацыр па Краіне. Займаўся звыклай і любімай сваёй справай – даўжэзным прутком лопаў паветраныя шары, з якіх была адбудавана добрая палова замкаў.

Куродыма цешыў занятак Дзюрабоя. Яму падабалася назіраць, як, пазбаўленыя жытла, туляліся па Краіне ў пошуках прытулку мары. Але чарадзей бесперапынна паўтараў, што па-сапраўднаму знішчыць Краіну яны

змогуць толькі тады, калі на зямлі занудзяцца ад дрэннага надвор'я, згубяць надзею на сонечныя дзянькі і перастануць марыць людзі.

І не так многа часу мінула, як людзі сапраўды пачалі маркоціцца, скардзіцца на благое надвор'е і сумаваць, зачыніўшыся ў кватэрах. Хто ведае, што было б, каб перастаў марыць пра святло і Данік.

# *У Краіне Паветраных Замкаў*

KAMUNIKAT.org

## Спатканне з залатым шарам

Зямля знікла за завесай туманоў адразу ж, як толькі божыя кароўкі разам з Данікам падняліся крыху вышэй дрэў. І адразу згубілася адчуванне вышыні: увесь час здавалася, што вандроўнікі таўкуцца на месцы, не ў стане выбіцца са шчыльных, як брудная шэрая вата, тумановых звіткаў. Нават спрактыкаваныя ў палётах на неба Ірыска і Хлебны Мякіш разгубіліся: упэўненнасці, што яны трымаюць правільны курс, у іх не было. Што ўжо казаць пра Даніка? Раней яму даводзілася лятаць да мора на самалёце разам з бацькамі. Але ж гэта – зусім іншая спарва! Там ён толькі любаваўся праз ілюмінатар на віды з вышыні і ніякага іншага клопату не меў.

Цяпер жа хлопчык не ў адпачынак з мамай і татам сабраўся, а на выратаванне прынцэсы ляцеў! Ён павінен быў нешта рабіць, каб дапамагчы божым кароўкам, але што – не меў уяўлення. Ён стаў нязвыкла маленькім – куды

меньшым, чым на зямлі. Пад рукамі не было нічога, каб нешта змайстраваць. Больш таго: і рукі былі занятыя! Данік аберуч трымаўся за божую кароўку, каб яго не здзьмухнула ветрам і напружана думаў, шукаючы выйсця. Раптам хлопчык ускрыкнуў:

-- Эх, каб тут быў хоць адзін з тых шароў, што я адпусціў у неба!

-- Дык гэта ты выпускаў шары? – з удзячнасцю ў голасе перапытала Хлебны Мякіш. – Шчыра кажучы, каб не яны, не ведаю, ці вярнулася б я дамоў. Яны ўверх падымаліся, а я за іх палётам сачыла і ўніз, на Зямлю, кіравала…

-- Ой! – раптам гукнулі ў адзін голас і божыя кароўкі, і Данік. Яны аб *нешта* стукнуліся і гэта *нешта* аказалася вялікім залатым шарыкам!

-- Гэта ж мой паветраны шар! – узрадваўся Данік. – Яго я незадоўга да сустрэчы з вамі выпусціў у неба!

Хлопчык злаўчыўся і, адной рукай трымаючыся за Ірыску, другой ухапіўся за нітачку, якой

шарык быў завязаны. І шар пацягнуў усіх за сабой наверх, па дарозе, з якой шарыкі не збіваюцца ніколі – у Краіну Паветраных Замкаў.

-- Дык гэта ты выпускаў шары апошнімі днямі? – паўтарыла пытанне Хлебны Мякіш. Прыстроіўшыся да залатога шара, вандроўнікі цяпер проста адпачывалі, даверыўшыся яго палёту, і маглі размаўляць.

-- Я! – пацвердзіў Данік.

-- А ў цябе што, дома склад паветраных шароў? – пацікавілася Ірыска.

Данік рассмяяўся.

-- Мне мама з татам кожны дзень шары дадому прыносяць! У іх работа такая – яны з паветраных шароў упрыгожванні робяць. Што хочаш зрабіць могуць: і гірлянды, і дамы, і дрэвы… Усе святы ў нашым горадзе іх работамі аздабляюцца. А я люблю шары з геліем – такія, як вось гэты, залаты. Гелій лягчэйшы за паветра газ, таму шары, напоўненыя ім, лётаюць. Іх я і адпускаў штодзень у неба!

-- Малайчына, Данік! – забыўшыся, што трэба трымацца за нітачку, божыя кароўкі запляскалі ў ладкі. Адно толькі імгненне – і сяброўак не стала бачна, бо шар падымаўся наверх, а яны, пакуль апомніліся і расправілі крылцы, некалькі імгненняў падалі ўніз.

Данік пачаў гукаць божых каровак. На шчасце, Ірыска і Хлебны Мякіш лётаць умелі і, кіруючы на голас, хутка адшукалі хлопчыка. Але далей ужо ляцелі моўчкі – здарэнне было перасцярогай паводзіць сябе абачліва.

KAMUNIKAT.org

## Дарога да каралеўскага замка

Хутка туман змяніўся на цемру. Гэта значыла, што вандроўнікі дасягнулі Краіны Паветраных Замкаў.

-- Усё, Данік, шар трэба адпускаць, да каралеўскага замка будзем прабірацца самі, -- зашапталі божыя кароўкі хлопчыку.

-- Як жа я хадзіць па аблоках буду? – захваляваўся Данік. – Я ж уніз звалюся!

Божыя кароўкі адмоўна закруцілі галовамі.

-- Ты на сябе глянь, Данік! Дзякуючы хлебу нябеснаму ты цяпер бязважкі, як самі мары. Але каб ты смялей пачуваўся, трымай! -- і сяброўкі дасталі з адной са сваіх торбачак плеценыя з лазы лыжы, падобныя на снегаступы.

А яшчэ Хлебны Мякіш дала кожнаму па празрыстаму плашчу-дажджавіку з капюшонам – каб прыкрыцца ад ліпкай цемры, якая напярэдадні перапэцала да непазнавальнасці яе крылцы.

Апрануўшы плашчык і абуўшы лыжы, Данік адпусціў шар, як і прасілі божыя кароўкі. Залаты шар адразу праглынула цемра. А хлопчык і божыя кароўкі стаялі на месцы, трымаючыся адзін за аднаго, каб не згубіцца.

-- Ісці па такой цемры проста немагчыма! Быў бы тут ліхтарык! – летуценна прамовіў Данік… і зноў сябры ахнулі. На галаве хлопчыка засвяціўся ліхтарык – якраз такі, які яны з татам бралі, калі хадзілі ў паходы. Яны спецыяльным абручыкам мацуюцца на галаве, каб рукі былі вольныя. Падобна, што тут, у Краіне Паветраных Замкаў, варта было нечага моцна пажадаць – і жаданні здзяйсняліся!

Зразумеўшы гэта, Данік у думках стаў прасіць кагосьці нябачнага знайсці

патрэбную дарогу да каралеўскага замка. Нібы ў адказ на яго просьбу лыжы развярнуліся і заслізгалі па аблоках, як па гарах – Ірыска і Хлебны Мякіш ледзь паспявалі за хлопчыкам. Але ліхтарык праразаў цемру, асвятляючы шлях, і

кампанія рухалася куды больш упэўнена, чым можна было сабе ўявіць.

Ірыска і Хлебны Мякіш са шкадаваннем азіраліся па баках. Краіна выглядала як пасля пажару. Задымленыя напаўразбураныя замкі; вясёлкавая брукаванка нібы сажай пасыпаная. І цішыня ўсюды, дзе раней гучалі песні і смех.

Данік у развалінах замкаў пазнаваў многае з таго, што некалі будаваў у марах сам. І яго перапаўняла жаданне знайсці і пакараць гэтага брыдкага чарадзея Куродыма, якому не шкада знішчаць такую цудоўную краіну!

Так, прыспешваючы сябе рашучымі марамі, вандроўнікі даволі хутка і без асаблівых прыгод дабраліся да каралеўскага палаца. Куродым і Дзюрабой нават не здагадваліся пра іх з'яўленне: яны крэпка спалі. Ад іх храпу ўжо некалькі дзён і начэй запар трэсліся сцены ў каралеўскім замку. Але гэты храп, які так раздражняў усіх жыхароў Краіны, для адважных вандроўнікаў быў выратавальным.

## Незадаволенасць Мараў

Апошнім часам вялікі каралеўскі замак стаў прытулкам не толькі для тых, хто застаўся без жылля з-за шкодніцтваў Дзюрабоя, але для ўсіх жыхароў

Краіны.

Каралева Мара Сапраўдная была сапраўднай ва ўсім. Сапраўднай уладаркай, якая клапацілася пра спакой сваіх падданых, і сапраўднай гаспадыняй, у якой для кожнага з гасцей знаходзілася і суцяшальнае слова, і добры позірк. Мары, разгубленыя ад таго, што рабілася апошнім часам у Краіне, хадзілі за ёй гужам, бо чакалі спачувальных слоў і адказаў на пытанне, што рабіць і як жыць далей.

Кароль Летуценнік Непапраўны XX блукаў па замку, як цень. Са знікненнем любімай дачушкі, прынцэсы Чысцюлі, ён страціў жыццёвыя сілы, адно толькі прыгалошваў і скардзіўся на лёс. Каралеве не было ад яго ніякай падтрымкі. Як

магла, яна да гэтай пары суцяшала і Яго Вялікасць, і сваіх падданых. Плакаць дазваляла сабе толькі ўпотай, каб ніхто яе не бачыў.

Спачатку падданыя успрымалі гэта як добры знак. Каралева трымаецца, значыць, ведае, што рабіць. Але час ішоў, Куродым сваім едкім дымам пачынаў не проста чадзіць, а труціць наваколле. Дзюрабой пашкодзіў добрую палову замкаў Краіны – а Мара Сапраўдная направа і налева толькі словы падтрымкі раздавала.

І падданыя, а з імі заадно і Яго Вялікасць, пачалі злавацца на сваю каралеву.

-- Відаць, у нашай каралевы няма сэрца, калі яна не гаруе па дачушцы, -- шапталіся прыдворныя і перадавалі свае здагадкі ўсім жыхарам Краіны. – Ці галавы няма на плячах, калі яна нічога не прадпрымае, каб прагнаць Куродыма з Дзюрабоем!

У Краіне – а, дакладней, у каралеўскім замку, куды перабралася насельніцтва ўсёй Краіны – спела незадаволенасць каралевай Марай

Сапраўднай. І было вырашана склікаць Савет Мар – вышэйшую раду Краіны. Калі яна збіралася апошні раз, ніхто не мог прыпомніць. Пакуль у Краіне ўсё было цудоўна, не было неабходнасці і ў скліканні Савета. Але пра Савет, на каторым мог выказацца кожны прысутны, помнілі ўсе. Так здарылася, што ў дзень, калі ён быў прызначаны, Данік разам з божымі кароўкамі і з'явіўся ў каралеўскім палацы.

KAMUNIKAT.org

## Данік на Савеце Мараў

Данік, Ірыска і Хлебны Мякіш прайшлі ў тронную залу і засталіся незаўважнымі – усе прысутныя шумелі, нешта даводзячы адзін аднаму. Але найперш, відаць, каралеве, якая сядзела на троне і, заплюснуўшы вочы, моўчкі ўсіх слухала.

Здавалася, кожны быў заняты толькі сваімі скаргамі і крыўдамі, і ніхто ні на кога не зважаў. Вандроўнікі спыніліся недалёка ад уваходу і моўчкі назіралі за тым, што адбываецца.

Былі ў зале і Высокія Мары, якія ад раздражнёнасці і злосці на абставіны здрабнелі і выглядалі мізэрнымі. Дробныя Мары скавыталі і хліпалі, што ніколі ўжо не стаць ім Вялікімі. А Безнадзейныя Мары наогул пачалі пагражаць перайсці на службу Куродыму, калі ім не дадуць разгарнуцца ва ўласнай Краіне.

Гаварылі пра свой няўдалы лёс і Нязздзейсненыя Мары, і Нявыказаныя. І ўсе папікалі каралеву --

Мару Сапраўдную -- за недагляд, за тое, што дапусціла ў Краіне разбурэнне.

Данік знямеў ад здзіўлення. Ад прыгожых Мар ён не чакаў такіх паводзін. Але пакуль хлопчык слухаў моўчкі ўсё, што адбывалася. Калі ж і кароль Летуценнік Непапраўны XX з папрокам прамовіў:

-- І праўда, каханая, што ж ты так?! – Данік не вытрываў і выступіў наперад, да трона.

-- Эх вы! – выдыхнуў хлопчык. – Усе разам на адну каралеву! У Краіны прынцэса, а ў яе ж дачушка прапала! Што вы самі зрабілі, каб каралеве дапамагчы?

Каралева схамянулася на троне, нібы апрытомнела, і адкрыла вочы. Першы раз пры ўсіх з іх выкаціліся слёзы.

У троннай зале стала так ціха, што стала чутна, як слёзы з веек упалі на падлогу і разбіліся. Каралева з ўдзячнасцю глядзела на вандроўнікаў. А Данік нават не заўважыў, што, пакуль гаварыў, ён стаў такога ж росту, як быў дома, а Ірыска і Хлебны Мякіш цяпер маленькімі чырвонымі

кропачкамі свяціліся ў яго на плячы. Божыя кароўкі не забыліся схіліцца ў ветлівым паклоне перад каралевай і прыселі, узяўшыся за краёчкі спаднічак.

-- Смелы рыцар, я чакала цябе, я ведала, што ты абавязкова прыйдзеш на дапамогу! – прамовіла каралева, ступаючы насустрач Даніку.

-- Што Вы, Ваша Вялікасць, -- сумеўся Данік, -- я звычайны хлопчык, а не рыцар. Я проста люблю марыць! Дома мяне за гэта нават часта папікаюць і дражняцца летуценнікам.

-- Ну, -- усміхнулася каралева, -- у нашай Краіне Летуценнік – самы высокі тытул!

Пры гэтых словах яна глянула на свайго мужа караля Летуценніка Непапраўнага XX. Той сумеўся, але адразу ж выцер хусцінкай твар ад слёз.

-- Тваё з'яўленне сведчыць, што Хлебны Мякіш перадала нашы мары і надзеі, што знойдзецца летуценнік, які вызваліць прынцэсу, а, значыць, усю Краіну!

Абняўшы Даніка і пацалаваўшы хлопчыка ў макаўку, каралева дадала:

-- Даруй за тое, што ты тут пачуў і пабачыў. Мае падданыя – самыя цудоўныя ў свеце Мары. Проста яны стаміліся чакаць і пачалі губляць

надзею. Нават я ўжо не ведала, на што спадзявацца. А з тваім з'яўленнем надзея нарадзілася зноў! Цяпер усё зменіцца, вось пабачыш!

Высакародныя словы каралевы, у якіх не было ні злосці, ні крыўды на сваіх падданых, зрабілі нешта чароўнае. У мар святлелі твары, пачыналі іскрыцца вочы, распраўляліся плечы і са словамі: "Даруйце, Ваша Вялікасць!" – яны схілялі галовы перад сваёй уладаркай.

Кароль Летуценнік Непапраўны XX заплакаў наўзрыд і ўпаў перад каралевай на калені:

-- Родная, я згубіў галаву ад гора, я думаў толькі пра сябе! Ты ж ведаеш – я без нашай Чысцюлькі жыць не магу!..

Каралева не здарма звалася Марай Сапраўднай. Яна нахілілася да караля, пагладзіла яго па галаве і сказала ўсім прысутным:

-- Гора Яго Вялікасці павінна быць зразумела ўсім, у каго ёсць дзеці. Не будзем строга судзіць свайго караля, падтрымаем яго!

І ўсе дружна заківалі галовамі, і новыя слёзы – даравання і замілавання – навярнуліся на вочы мараў. Пасля каралева зноў з надзеяй глянула на Даніка:

-- Мой рыцар, мы чакаем тваіх цудоўных подзвігаў!

Данік зноў сумеўся ад такога звароту. Ён быў простым хлопчыкам, які нават у школу яшчэ не пайшоў. Ён любіў марыць, але дакладна ведаў, што мары можна здзейсніць толькі тады, калі пачынаеш нешта рабіць. Ён у гэтым ужо не раз пераканаўся, пускаючы дома караблікі ці майструючы папяровых змеяў… Можа, гэта каралева і лічыць цудам?

Калі Данік прамовіў гэтыя думкі ўслых, то ўбачыў, як ва ўсіх мараў, не выключаючы караля і каралеву, акругліліся вочы. Пра тое, што трэба нешта *рабіць* для здзяйснення мараў, яны нават не думалі. Да гэтай пары жылі марамі – і ўсё у іх атрымлівалася. Імгненне панавала цішыня, а пасля кароль Летуценнік Непапраўны XX ўсміхнуўся, ляпнуў далоняй сабе па лбу і выгукнуў:

-- Не дадумацца да такога простага выйсця! Гэта ж трэба да Куродыма хаця б разведку пасланць!

Акрыленыя нечаканым для сябе адкрыццем, усе мары навыперадкі сталі прапаноўваць сябе ў разведчыкі. Але, падумаўшы, вырашылі адправіць падслухаць, пра што шэпчуцца Куродым з Дзюрабоем, Дробныя Мары. Яны такія драбнюткія, што незаўважанымі прабяруцца ў кожную шчылінку і абавязкова дазнаюцца пра ўсё, што трэба!

Дробныя Мары, займеўшы новую мару – праявіць адвагу і стаць вялікімі – юркнулі з замка і зніклі ў непраглядннай цемры.

# *Вызваленне прынцэсы*

KAMUNIKAT.org

## Куродым выхваляецца сваёй сілай

Злы чарадзей Куродым ляжаў на баку і ківаў нагой. Ля яго завіхаўся, расчэсваючы грабеньчыкам кудлатыя валасы чарадзея, касмічны пірат Дзюрабой. Хітрун выслужваўся перад магутным гаспадаром як мог і не грэбаваў ніякай работай.

Непадалёк ад разбойнікаў стаяла клетка. Дзе яны яе надыбалі – невядома. Але ў клетцы сядзела прынцэса Чысцюля. Задумка патрымаць прынцэсу ў торбе ў хуткім часе падалася хаўруснікам няправільнай. Ім хацелася бачыць штохвіліны, як гэта Чысцюлька будзе пакутваць і ліць слёзы.

Але прынцэса Чысцюля трымалася годна, не паказвала сваёй роспачы крыўдзіцелям і не лаялася з імі. Тады, каб раззлаваць дзяўчынку і хоць неяк зачапіць, разбойнікі прыдумалі вельмі смешны, на іх погляд, занятак. Яны сталі падкідваць чароўнае рэшата – адзінае, якога

больш не было ні ў Краіне Паветраных Замкаў, ні ў суседніх з ёй далінах – і гуляць з ім, як з мячыкам. Пры гэтым Куродым выхваляўся сваёй сілай і казаў:

-- Трошкі нават шкада гэтых дурных жыхароў Краіны. Яны ж думаюць, што за мяне мацнейшыя. Во, няхай цяпер адужаюць мяне, як іх Чысцюлька ў палон трапіла. Добрых мар, кажуць, болей... Паглядзім, паглядзім... Чаду і злосці з Зямлі таксама нямала ідзе. Людзям жа на ёй усё дрэнна жывецца. Наесціся трэба напоўніцу, абы не лопнуць. Апрануцца – прыгажэй, чым тыя, хто побач. Ездзіць – на самых хуткіх машынах... А што гэта значыць, даражэнькі Дзюрабой? Правільна, іх заводы і фабрыкі дымяць і дымяць без перадыху, каб усе "хачу" людзей споўніць... А ўжо сварацца яны колькі, гэтыя людзі, а ўжо колькі за адны толькі цацкі дзяруцца, а ваююць!.. Вось не стала Чысцюлі, скінулі мы яе з хмаркі, адабралі рэшата -- я і мацнею з дня ў дзень. А над Зямлёй ні сонца,

ні сіняга неба. Толькі туман, а калі так справы і найдалей пойдуць, і цемры ім нашай знішчальнай напусцім. Во ўжо я ім тады не пазайздрошчу! Праўда, чароўная прынцэса? Гы-гы-гы! – рагаталі разбойнікі. – А мары і не дадумаюцца на тваё выратаванне выйсці, хоць і трэба ўсяго кавалак мыла і вядро чыстай вады, каб мяне адужаць. Ну, не люблю я чыстай вады, а мыла проста не выношу! – рагатаў Курадым, а Дзюрабой ажно заходзіўся ад смеху “Гы-гы-гы!!”

KAMUNIKAT.org

## Неператожная зброя

Прынцэса Чысцюля нічога не адказвала на здзеклівыя пытанні Куродыма.

Не пагадзіцца са злым чараўнікам прынцэса не магла, бо сапраўды процьму вялізных торбаў з дымам, злосцю, благімі думкамі з зямлі на касмічныя сметнікі адправіла.

Аднак супраць праўды Куродыма ў яе была неператожная зброя: вера ў прыгожыя чалавечыя мары. Яна іх таксама нямала ў Краіну Паветраных

Замкаў жыць пусціла! Былі гэта мары людзей пра мір, пра здароўе, дружбу, спакой... Было гэтых мараў многа, яны ішлі з кожнага дома. Прынцэса Чысцюля спадзявалася, што некалі ўсе мары людзей стануць добрымі справамі – і тады торбаў з куродымам у яе паменьшае, а, магчыма, і зусім не стане.

Але прынцэса не прамаўляла ўслых сваіх думак гэтым боўдзілам – Куродыму і яго памагатаму

Дзюрабою. Яшчэ раззлуюцца і закінуць куды чароўнае рэшата. А яно ёй спатрэбіцца, як яна выйдзе на волю – парадкавацца...

Доўгі час прынцэса сядзела і думала моўчкі. А пасля яна пачала спяваць песеньку:

Я саўю сабе вяночак –
З буйных зорак, з песень звонкіх.
На магутных крылах ветру
Адпушчу яго на волю.
І развее вецер песні,
Раскідае ў небе зоры
Каб пабольшала на свеце
Чалавечых добрых мараў...

Прынцэса спявала, а Куродым і Дзюрабой, якія спачатку крывенька пасміхаліся на словы “чалавечых добрых мараў”, раптам пачалі драмаць – і заснулі. Так прынцэса Чысцюля вынайшла ўправу на разбойнікаў. Словы песні дзейнічалі на іх, як чароўная калыханка -- вось

чаму ўжо некалькі дзён і начэй над Краінай Паветраных Замкаў стаяў страшэнны храп. За ім не было чуваць голасу прынцэсы. А яна старалася, спявала – сама ж адчыніць клетку і выбрацца адсюль прынцэса не магла.

KAMUNIKAT.org

## Дробныя Мары становяцца Вялікімі

Праўду кажучы, Дробным Марам было вельмі-вельмі страшна караскацца туды, адкуль чуўся храп. Але, падбадзёрваючы адна другую, у суцэльнай цемры яны ўзбіраліся па самай высокай вежы каралеўскага замка, макаўка якой заўсёды хавалася за аблокамі. І, узняўшыся на самы верх, разведчыкі пачулі... голас прынцэсы Чысцюлі! Не даючы сабе веры, яны так хутка, наколькі маглі зрабіць гэта ў цемры, скочылі на воблака і пайшлі на голас.

А хутка ўбачылі сваю любімую прынцэсу, зачыненую ў клетцы!

За час няволі прынцэса не змянілася ні кропелькі: відаць, яе думкі былі такімі чыстымі, што нават Куродым не мог запэцаць прынцэсу сваім чадам. Ад клеткі, у якой сядзела і спявала прынцэса, зыходзіла цьмянае святло. Але яго было досыць, каб агледзецца па баках. І Дробныя Мары ўбачылі, што страшны чарадзей Куродым і яго

памагаты, касмічны пірат Дзюрабой, спяць моцна-моцна.

Тады Дробныя Мары зусім асмялелі. Яны наблізіліся да клеткі, і прынцэса шчасліва заўсміхалася, пазнаўшы сваіх добрых сяброў.

Тут былі мары пра вялізны торт, які можна з'есці аднаму і адразу; мары пра маленькага сабачку на дзень нараджэння; мары пра камп'ютэр і веласіпед... Яны зваліся дробнымі, але аздаблялі нечае жыццё – і прынцэса Чысцюля любіла іх. Але, калі шчыра, ніяк не чакала, што яны здагадаюцца і не збаяцца першымі з'явіцца тут, каля страшных разбойнікаў.

Але доўга дзівавацца часу не было. Прынцэса Чысцюля толькі на хвілінку перапыніла спевы і папрасіла расказаць, што робіцца ў Краіне. Пасля яна заспявала зноў – каб разбойнікі не прачнуліся, а мары хуценька зашапталі:

-- Не хвалюйцеся, дарагая прынцэса! Пацярпелі замкі Краіны, але пакуль няма страт сярод жыхароў. Вашы мама і тата жывыя і здаровыя.

Мы ўсе вельмі, вельмі гаравалі і маркоціліся. І нават непрыгожа паводзілі сябе, -- пачырванелі Дробныя Мары. – Але нядаўна божыя кароўкі Ірыска і Хлебны Мякіш – напэўна вы іх ведаеце – прывялі ў Краіну смелага рыцара, Летуценніка Даніка. Ён нам адкрыў адну таямніцу, і мы пайшлі на разведку! -- прамовілі Дробныя Мары з запалам.

-- Малайцы!!! – пахваліла іх шчаслівая прынцэса. – Слухайце мяне ўважліва, надоўга перарываць спеў нельга. Я тут наслухалася шчырасцяў Куродыма і ведаю, як знайсці на яго ўправу...

Як мага бліжэй наблізіліся да прынцэсы мары, яна ім нешта хуценька зашаптала. Мары ўважліва слухаліся і ўсміхаліся... Пасля прынцэса заспявала зноў. А мары згодна заківалі галовамі і слізганулі з аблокаў назад, у Краіну. Трэба сказаць, што яны ўвачавідкі паболшалі і з дробных ператварыліся ў вялікія.

....Злы чарадзей Куродым і яго памагаты Дзюрабой храплі на ўсё неба і нават не снілі, што хмары збіраюцца над іх галовамі.

KAMUNIKAT.org

## Паход на разбойнікаў

План прынцэсы быў просты. Яна наказала ўсім жыхарам Краіны пазнаходзіць месцы, дзе боўтаюцца кудлатыя пасмы Куродыма, і заблытаць, прывязаць іх. Гэта было зрабіць неабходна. Раптам чарадзей адчуе небяспеку і рынецца ўцякаць? Дазволіць гэтага яму нельга, бо, калі надумае вярнуцца, бяды не абярэшся. Як будзе Куродым крэпка прывязаны, прынцэса прасіла самых смелых падняцца да яе. З сабой трэба было мець вядро чыстай вады і кавалак мыла.

Адзінае, што не змагла прыдумаць прынцэса – як адабраць даўжэзны прутoк у Дзюрабоя. Шкадлівы нораў пірата яна ўжо вывучыла добра і вельмі перажывала, каб ён, адступаючы, не пашкодзіў тыя замкі, якія ў Краіне яшчэ ацалелі...

Вярнуўшыся ў каралеўскі замак, Дробныя Мары наперабой расказвалі пра ўсё, што ўбачылі. Кароль і каралева, а разам з імі ўсе жыхары

Краіны, плакалі і смяяліся ад шчасця, даведаўшыся, што прынцэса Чысцюля жывая! Ад радасці Дробных Мар пачалі падкідваць на руках. А кароль Летуценнік Непапраўны XX адразу ж абвясціў, што прысвойвае ім тытул Мар Адважных… Усе радваліся і весяліліся і, здавалася, нават забыліся, што Куродым яшчэ не знішчаны – мары заставаліся марамі.

Данік, які ад радасці разам з марамі лунаў так высока, наколькі можна было падняцца – пад самай столлю, бо ў Краіне гэта было магчымым – адумаўся першым і падышоў да караля і каралевы.

-- Прабачце, але нам трэба просьбу прынцэсы выканаць. Яна ж там можа і стаміцца спяваць. А як Куродым з Дзюрабоем прачнуцца?..

Канешне ж, трэба спяшацца! Мары, усе да адной, высыпалі з каралеўскага замка на вуліцу. Упершыню за доўгі час, што ў Краіне гаспадарыў Куродым, ім не было страшна. І мо ад гэтага на вуліцы стала трошкі святлей. Ва ўсякім разе,

цемра перастала быць непраглядная. Таму рухацца па вуліцах стала магчымым. І хутка ўжо доўгія неахайныя пасмы Курадыма былі крэпка прывязаныя да дрэў, вежаў, неразбураных замкаў, да мастоў над рэчкамі...

Адважныя Мары гатовыя былі весці да прынцэсы атрад вызваленцаў... Але вось бяда: ніхто не ведаў, дзе ўзяць вядро чыстай вады, бо ў Краіне за час панавання Курадыма яна ўся забрудзілася. Не было і мыла.

Мары разгублена маўчалі – ранавата, відаць, яны радваліся. Стаяў засмучаны і Данік. Але тут на дапамогу прыйшлі Ірыска і Хлебны Мякіш.

-- А як, Данік, у цябе ліхтарык з'явіўся? А як мы залаты шар сустрэлі? Ты забыўся? У Краіне Паветраных Замкаў здзяйсняецца тое, чаго вельмі моцна захочаш!

Што праўда, тое праўда! Данік заплюшчыў вочы і ўявіў сябе ў вёсцы, ля калодзежа, з вядром, поўным чысцюткай вады. Праз плячо ў яго вісеў

вялікі ручнік, а ў руцэ хлопчык трымаў кавалак духмянага мыла…

Мары задаволена загулі, бо і ў руках у Даніка імгненна з'явілася і вядро з вадой, і мыла, і ручнік!

Вось цяпер можна было выпраўляцца ў паход. Жыхары Краіны асмялелі зусім і абвясцілі, што караскацца па дахах яны не будуць! У Каралеўстве быў лятаючы карабель – у яго і сеў атрад Дзёрзкіх Мараў.

KAMUNIKAT.org

**Перамога**

Да месца дабраліся якраз тады, калі і Куродым, і Дзюрабой, адурэўшы ад спання і нагледзеўшыся сноў пад спевы прынцэсы Чысцюлі, пачыналі ўжо абуджацца. Куродым спачатку адкрыў правае вока, Дзюрабой – левае… І абодвум падалося, што яны ўсё ж яшчэ спяць і бачаць самы жахлівы сон. Проста перад імі лунаў карабель, поўны Адважных Мараў. А з імі быў хлопчык, і ў руках ён трымаў страшную зброю – мыла і чыстую ваду!

Ад жаху закрычалі і Куродым, і Дзюрабой – і раптам зразумелі, што яны ўсё ж не спяць. Тады Куродым ірвануўся з усіх сіл уцякаць – але яго не пускалі крэпка прывязаныя валасы. Тады хітрун кінуўся ў перамовы:

-- Даражэнькія Мары! Я не крыўдзіў вашу прынцэсу! Праўда ж, Чысцюлечка? Так, пасваволіў трошкі, дык і тое таму, што мяне гэты

брыдкі касмічны пірат навучыў. Каб не ён, я б спаў сабе ў торбах…

-- Ах, дык гэта я вінаваты? Шэльма ты кудлатая! – абурыўся Дзюрабой. – Ты ж адпомсціць прынцэсе хацеў, вось мы яе і злавілі! – крычаў ён.

І хаўруснікі пачалі сварыцца, даводзячы, хто задумаў спачатку Краіну Паветраных Замкаў знішчыць. Але іх сварку перапыніла прынцэса Чысцюля:

-- Досыць, наслухалася ўжо вашых гаворак! – сказала яна. – Вярніце чароўнае рэшата!

Дзюрабой подбегам кінуўся выконваць загад прынцэсы. І не слухаў, як на яго сычэў Куродым – цяпер ужо Дзюрабой спяшаўся выслужыцца перад жыхарамі Краіны, да якіх у яго на вачах вярталася ўлада і сіла. Ён і рэшата прынцэсе падаў, і замок на клетцы адчыніў, і паслужліва схіліўся ў паклоне.

А прынцэса выйшла з клеткі, ўсім усміхнулася і папрасіла Даніка, паказаўшы на Куродыма:

-- Калі ласка, дапамажы мне адмыць гэта страшыдла. Адной мне не справіцца!

І Данік пачаў ліць ваду на Куродыма, мыліць яму галаву. А каб ямчэй атрымлівалася, даў ручнік Адважным Марам, і яны церлі злога чараўніка.

Ён спачатку немачкі роў і выкручваўся, вырываўся што сілы. Але шчыравалі і Мары, і Данік. Бруд, які сцякаў з Куродыма, прынцэса Чысцюля прапускала праз чароўнае рэшата. Прайшоўшы праз яго, злосны Куродым ператвараўся ў чысцюткія ручаінкі і белыя пухнатыя хмаркі. Яны весела пабеглі па небе. І хутка голасу Куродыма зусім не стала чутно, бо ён проста знік:

-- Чыстая работа! – пахваліла прынцэса Чысцюля. – Нават у торбы пакаваць і адпраўляць на касмічны сметнік нечага.

Пакуль чысцілі Куродыма, на Дзюрабоя забыліся. А ён, як толькі пасвятлела вакол і сталі відаць абрысы замкаў ў Краіне, схапіў свой

даўжэзны пруток і нацэліў яго на каралеўскі замак. На шчасце, у гэта імгненне Дзюрабой трапіўся на вочы Даніку. Хлопчык тут жа пажадаў мець вялікі магніт – і праз імгненне ўжо трымаў яго ў руках. Ён нацэліў магніт на касмічнага пірата, і пруток, зроблены з жалеза, вырваўся з рук разбойніка і прыліп да магніта.

Так абясшкодзілі і Дзюрабоя, і выгляд у касмічнага пірата стаў зусім разгублены.

-- І што мне цяпер рабіць, чым займацца? Няма маёй надзейнай, вернай зброі! – захліпаў ён.

-- А ты толькі разбураць і рабаваць умееш? – запытала пірата прынцэса Чысцюля. – Успомні, пра што ты марыў, як быў маленькім?

-- Мала пра што я марыў! – зазлаваўся Дзюрабой. – Будаваць палацы марыў, вось што! А дзе гэтым займацца, калі мы, піраты, прыстанку не маем, гойсаем па Сусвеце. Хацеў да Зямлі дабрацца, дык вы ж не далі!

З вачэй у Дзюрабоя пацяклі злосныя слёзы. Усе, хто гэта бачыў, сказалі, што так і трэба гэтаму

бандыту, няхай паплача. Але прынцэса Чысцюля, падумаўшы, прамовіла:

-- Паслухай, Дзюрабой! А заставайся у нашай Краіне! Цяпер тут многае трэба адбудоўваць, сілы твае спатрэбяцца. На Зямлю будзеш штодзень любавацца, яе ад нас добра відаць. А як спатрэбіцца, на сваёй лятаючай талерцы торбы з куродымам паможаш на касмічныя сметнікі адвозіць. Справішся?

Дзюрабоя ўразіла нечаканая прапанова прынцэсы. Ён нават адчуў, як нешта ўнутры яго нібыта шчоўкнула, і благія думкі перавярнуліся на лепшыя.

-- Гэта... Трэба паспрабаваць, -- сказаў ён, сумеўшыся. – А калі мне захочацца шарыкі палопаць? Так люблю, як яны страляюць!

-- А табе яшчэ больш спадабаецца іх надзімаць, вось убачыш! І зваць цябе цяпер мы будзем не Дзюрабоем, а панам Дзьмухайлам, згода?– весела сказала прынцэса Чысцюля і рашуча дадала: -- Сядай у карабель!

-- А я лепш на сваёй талерачцы, можна? – спытаў Дзюрабой, якому быць панам Дзьмухайлам у Краіне Паветраных Замкаў падалося вельмі прывабным.

KAMUNIKAT.org

## Баль у Краіне Паветраных Замкаў

Калі пераможцы, а з імі і пан Дзьмухайла спусціліся на пляц перад каралеўскім замкам, там стаялі ўсе да адзінага жыхары Краіны на чале са сваімі каралём і каралевай. Яны радасна віталі Адважных Мар, Даніка, божых каровак. Прынцэсу Чысцюлю адразу падхапілі і панеслі на руках. Усе абдымаліся, цалаваліся, скакалі ад радасці. А ў руках у кожнага былі… не, не кветкі. Шчоткі, анучкі, венікі, палівачкі! Марам так спадабалася дзейнічаць, што адразу ж пасля сустрэчы пераможцаў на чале з прынцэсай Чысцюляй яны ўзяліся прыбірацца ў сваёй Краіне.

Адмывалі і чысцілі брукаванку, замкі, лістоту на дрэвах, пялёсткі на кветках, мурзатых дзетак, сабачак і птушак… І хутка пад промнямі сонца, якое засвяціла ў Краіне адразу ж, як расправіліся з Куродымам, усімі колерамі вясёлкі зазіхацела наўколле.

Вось калі і Данік змог налюбавацца на Краіну, пра якую столькі марыў дома і якая яму ўяўлялася менавіта такой прыгожай, якой яна і была.

Сваёй стараннасцю ўсіх здзіўляў і цешыў пан Дзьмухайла. Ён так захапіўся навядзеннем парадкаў, што зусім забыўся на свой разбойніцкі нораў. Зрэшты, яго сваякі, касмічныя піраты, Дзюрабоя вучылі толькі рабаваць. А ў яго такі талент да парадку выявіўся!

Былы Дзюрабой рамантаваў пашкоджаныя замкі, папраўляў масты – адным словам, хапаўся за самую складаную і цяжкую работу.

І жыхары Краіны Паветраных Замкаў даравалі яму былыя правіны. Ніколі пасля былы пірат не пачуў ад іх зняважлівага “Дзюрабой”. Заўсёды да яго звярталіся з павагай:”Пан Дзьмухайла!”

Прынцэса Чысцюля, як толькі прывіталася з мамай і татам, адразу ж заняла звыклае месца на хмарцы. Узяўшы ў рукі чароўнае рэшата, яна пачала прасейваць туманы, што ўсё яшчэ віселі

над зямлёй. Проаз некаторы час яны парадзелі, і на зямлю прабілася даўгачаканае сонца!

Ад радасці людзі таксама выбеглі на вуліцы і пачалі пускаць салюты. У тым ліку – і з паветраных шароў. Усе яны ляцелі ў неба, па дарозе, з якой ніколі не збіваліся – у Краіну Паветраных Замкаў. А там іх сустракаў пан Дзьмухайла і разам з памочнікамі адбудоўваў новыя замкі.

...А пасля, справіўшыся і навёўшы ўсюды парадкі, у каралеўстве наладзілі баль! Рабочае адзенне мары змянілі на шыкоўныя ўборы, шчоткі і венікі ў руках – на букеты руж.Усе танцавалі і весяліліся ад душы, а кароль Летуценнік Непапраўны XX і каралева Мара Сапраўдная раздавалі ўзнагароды ўсім прысутным: каму за мужнасць, каму за стойкасць, каму за працавітасць. Узнагародамі служылі ледзянцы: усе мары, як і мы з вамі, вельмі любілі салодкае.

Даніка ўзнагародзілі за мудрасць, Ірыску Хлебы Мякіш – за вернае сяброўства. Усім траім бясконца паўтаралі, што без іх Краіна прапала б.

-- Што вы! – запярэчыў Данік. – Я шчаслівы, што пабываў у вас і здолеў трошку памагчы. Але, мне здаецца, вы і без мяне справіліся б.

-- Вось тут ты памыляешся, Данік, -- адказала яму каралева. – Кожны на сваім месцы зрабіў сваю справу. Хлебны Мякіш прынесла на зямлю вестку, што у нашай Краіне бяда. Ірыска разам з ёй кінулася нам на падмогу. Ты не пабаяўся выправіцца ў незвычайнае падарожжа і навучыў нас таму, пра што мы, мары, нават не задумваліся: дзейнічаць. Ну а пасля ўжо, канешне, і кожны з нас пастараўся. І ўсе разам мы ратавалі Краіну! А глянь на зямлю – якое там свеціць сонца!

Каралева крышку рассунула воблакі, і Данік убачыў зялёныя палі, лясы, рэкі і родны горад, заліты сонечным светам… Яму раптам вельмі-вельмі захацелася дадому.

-- Дзякуй, Ваша Вялікасць, за гасціннасць! – ветліва сказаў ён. – Але мама з татам, відаць, хвалююцца, куды я знік.

На развітанне прынцэса Чысцюля запрасіла Даніка на танец. Хлопчык імгненна навучыўся танцаваць вальс, бо вельмі не хацеў падацца няўклюдам прынцэсе Чысцюлі, глянуць на якую мараць усе прынцы. І яго жаданне збылося – мы ж памятаем, што ў Краіне Паветраных Замкаў збываецца ўсё добрае, што ні пажадаеш.

Пакуль Данік з прынцэсай Чысцюляй луналі ў вальсе пад аблокамі, Ірыска і Хлебны Мякіш справіліся злётаць у Цукерачную і Хлебную даліны і напоўнілі свае торбачкі булкамі і цукеркамі – для сяброў і сваякоў. І для тых хлопчыкаў і дзяўчынак, што будуць шчыра чакаць іх нябесных гасцінцаў.

А пасля, адвітаўшыся з жыхарамі чароўнай краіны, кампанія сабралася ў зваротны шлях. Данік зноў паменшыўся, божыя кароўкі пабольшылі, падхапілі яго на плечы і паляцелі.

Прынцэса Чысцюля, кароль з каралевай, усе мары, а разам з імі і пан Дзьмухайла, шчаслівы сваім новым заняткам, да той пары махалі ўслед сябрам, пакуль бачылі іх.

Вярнуўшы дадому Даніка, божыя кароўкі паляцелі да сваіх хатак. Вось цяпер яны маглі суцешыць сваякоў, парадаваць іх салодкімі гасцінцамі і наладзіць сапраўдны банкет! Гэтым Ірыска і Хлебны Мякіш і заняліся.

А Данік, зноў ператварыўшыся ў звычайнага хлопчыка, выбег гуляць на вуліцу. Там кішма кішэла і дзяцей, і дарослых – усе святкавалі вяртанне сонечнага святла.

З работы вярталіся мама і тата Даніка. Яны нават не заўважылі знікнення сына. Час у Краіне Паветраных Замкаў ішоў зусім па іншаму, чым на зямлі, і ўсе прыгоды Даніка і божых каровак змясціліся ў адзін рабочы дзень.

Мама і тата зноў прынеслі Даніку вялікі – на гэты раз блакітны – паветраны шар. Хлопчык папрасіў тату зрабіць на шары надпіс:

“Падарунак прынцэсе Чысцюле,” – і адразу ж выпусціў шар у неба.

На роспыты дарослых, хто такая прынцэса Чысцюля, хлопчык расказаў усю праўду. Але дарослыя толькі ўсміхнуліся, назваўшы яго безнадзейным летуценнікам.

А мама яшчэ дадала:

-- Прыгожа расказваеш! Трэба запісаць – цікавая гісторыя атрымаецца!

Данік ні кропелькі на дарослых не пакрыўдзіўся. Ён заўсёды быў добрым хлопчыкам, а пасля падарожжа ў Краіну Паветраных Замкаў і знаёмства з прынцэсай Чысцюляй стаў старацца зусім, не крыўдзіцца, не злавацца, не сварыцца ні з кім і не казаць благіх слоў. Яны ж разам з паветрам падымаюцца ў неба. А там на воблачку сядзіць прынцэса Чысцюля і прасейвае яго, ачышчае – каб ніколі больш Куродым не запанаваў над Краінай. Няхай прынцэсе будзе меней работы і больш часу

танцаваць на балях – у яе гэта так цудоўна атрымліваецца!

Праўда, цяпер ёй спраўляцца стала лягчэй, бо пан Дзьмухайла – былы Дзюрабой – аказаўся дбайным памочнікам. Ад былога касмічнага пірата ў яго засталося адмысловае ўменне кіраваць лятаючай талеркай. На ёй ён вывозіць на касмічны сметнік торбы з куродымам.

А яшчэ Данік часта бачыць Ірыску і Хлебны Мякіш. Сяброўкі частуюць яго цукеркамі і булкамі, што спраўна носяць з неба, і разам сябры згадваюць нядаўнюю вандроўку.

KAMUNIKAT.org

# Змест


***Сіла хлеба нябеснага***

Салодкае жыццё

У палоне шэрых тумаоў

Вяртанне Хлебнага Мякіша

Нечаканая навіна

Сустрэча з Данікам

***Зладзейства чарадзея Куродыма***

Вялікі клопат прынцэсы Чысцюлі

Касмічны пірат Дзюрабой вызваляе Куродыма

Планы Дзюрабоя пачынаюць здзяйсняцца

***У Краіне Паветраных Замкаў***

Спатканне з залатым шарам

Дарога да каралеўскага замка

Незадаволенасць Мараў

Данік на Савеце Мараў


KAMUNIKAT.org

***Вызваленне прынцэсы***

Куродым выхваляецца сваёй сілай

Непераможная зброя

Дробныя Мары становяцца Вялікімі

Паход на разбойнікаў

Перамога

Баль у Краіне Паветраных Замкаў

KAMUNIKAT.org